ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
18 сакавіка
1993 года
№ 4
(1691)

УДАКЛАДНЯЕМ

ЦІ СТАНЕ ЖУРФАК ІНСТЫТУТАМ?

Як паведаміла на мінулым тыдні агенцтва БЕЛАплан, факультэт журналістыкі нашага універсітэта мае намер у хуткім часе пераўтварыцца ў Інстытут журналістыкі Рэспублікі Беларусь, у якім плануецца адкрыць чатыры факультэты: рэпарцёрскі — 3 гады навучання, аналітычнай журналістыкі — 5 год навучання, завочны і факультэт прафесійнага ўдасканалення. З нагоды такіх перамен рэдакцыя «Беларускага універсітэта» вырашыла высветліць усё ў дэкана факультэта Алега Георгіевіча СЛУКІ.

— Алег Георгіевіч, а як вы асабіста ставіцеся да пераўтварэння роднага факультэта ў Інстытут?

— Справа ў тым, што, як гаворыцца ў прымаўцы, без мяне мяне ажанілі. Міністэрства інфармацыі распрацоўвае праект развіцця інфармацыйнай прасторы, і ў гэтым праекце (нават не ведаю кім) унесена прапанова стварыць самастойны Інстытут журналістыкі Рэспублікі Беларусь, які б рыхтаваў спецыялістаў для сродкаў масавай інфармацыі. Асабіста я не супраць такіх перайменаванняў, але ж справа ў сутнасці. Нідзе ў свеце няма інстытутаў журналістыкі. У Варшаве, напрыклад, існуе факультэт журналістыкі, які самым шчыльным чынам звязаны з універсітэцкім навучаннем, бо з'яўляецца факультэтам Варшаўскага універсітэта.

— Хіба такая розніца паміж факультэтам і інстытутам?

— Інстытут — гэта самастойная вучэбнае падраздзяленне. Без сур'ёзнай універсітэцкай базы мы апусцімся да ўзроўню сярэдне-тэхнічнай установы, якая будзе рыхтаваць рамеснікаў, а не кваліфікаваных спецыялістаў, да чаго мы імкнемся. На факультэце ўжо ўведзены новыя дысцыпліны і спецыяльнасці: фотажурналістыка, камп'ютэрны дызайн, рэдактар па рэкламе, тэле- і радыёкаментатар, рэдактар па перакладу, рэдактар выдавецтва, міжнародная журналістыка.

Падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў можна весці як на факультэце, так і ў інстытуце. Пытанне ж пакуль не вырашана. Яно яшчэ будзе разглядацца ў Вярхоўным Савеце.

Удакладняла Вольга УЛЕВІЧ.

ЦЯЖКІ ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

Выдавецкая кампанія «Беларусь-тэхналёгія» тыражом 1 тысяча экземпляраў выпусціла «Расейска-беларускі хімічны слоўнік».

Вайну нястачы дапаможнай тэрміналагічнай літаратуры аб'явіла «Задзіночанне беларускіх студэнтаў», якое плануе ў далейшым выдаць слоўнік анатамічнай наменклатуры і фізіялагічны слоўнік.

Дапамаглі ў выхадзе слоўніка ў свет народны дэпутат Беларусі **Уладзімір НОВІК**, фірма **«ДАЙНОВА»** і наш суайчыннік з Францыі **Міхась НАВУМОВІЧ.**

З. МАРАВА.

Новы час, новыя цэны

З 1 верасня 1992 года ва універсітэце дзейнічаюць новыя правілы арганізацыі работы з замежнымі студэнтамі. Парадак напісання заяў і прадастаўлення дакументаў застаўся ранейшым, а вось у парадку аплаты адбыліся пэўныя змены.

Зараз аплата ідзе толькі ў цвёрдай валюце: студэнт гуманітарнага факультэта плаціць 1300 долараў ЗША за год навучання, студэнт прыродазнаўчага факультэта — 1500, аспірант гуманітарнага факультэта — 1800, аспірант прыродазнаўчага — 2000.

Калі раней існавала скідка для студэнтаў з краін, якія стаяць на шляху развіцця, і яны плацілі ў рублях, то зараз выключэнняў няма. Праўда, у маі 1992 года Савет Міністраў прыняў рашэнне, згодна з якім студэнты, што прыехалі да нас раней па дзяржаўнай лініі, закончаць свае навучанне за кошт рэспублікі.

Створаны таксама ўмовы, якія павінны зацікавіць і выкладчыкаў факультэтаў у працы з замежнымі студэнтамі: дзесяць працэнтаў рублёвай сумы, атрыманай ад замежных стуэнтаў, ідзе ў прэміяльны фонд, 50 працэнтаў валютных сродкаў ідуць на патрэбы факультэтаў, якія займаюцца навучаннем замежных студэнтаў.

І ўсе ж выдатнікам пакінуты шанц на агульных падставах (бясплатна) вучыцца ў аспірантуры.

ЗАЗІРНІЦЕ І КУПІЦЕ

ІНФАРМАТЫКА-93

З 17 па 19 сакавіка ў Мінску праходзіць першая выстава-продаж сучаснай камп'ютэрнай тэхнікі і праграмнага забеспячэння «Інфарматыка-93». Арганізатары выставы — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Рэспубліканскі фонд алгарытмаў і праграм Міністэрства адукацыі рэспублікі Беларусь.

Кожны дзень з 10 да 16 гадзін выстава будзе дэманстравацца ў холе 4 паверха галоўнага корпуса БДУ. На выставе будуць прадстаўлены персанальныя ЭВМ айчынных і замежных фірм, перыферыйныя прылады, ахоўныя экраны, дыскеты, прыкладныя праграмныя прадукты для разнастайных сфер дзейнасці, сістэмнае ліцэнзіённае праграмнае забеспячэнне, навучанне рабоце на ПЭВМ для пачынаючых і прафесіяналаў, гарантыйнае абслугоўванне і рамонт тэхнікі, абслугоўванне камп'ютэрнай інфармацыйна-камерцыйнай сеткі.

Паколькі «Інфарматыка-93» — першая падобная выстава, цэны на ёй будуць невялікія. Асноўная мэта выставы — даць поўную інфармацыю аб становішчы на камп'ютэрным рынку рэспублікі. Універсітэт жа мае ўнікальную магчымасць паказаць узровень сваіх навуковых распрацовак, прапанаваць сваю прадукцыю.

«ЭБЕРТ-НАРПІТ» ПРАГАРАЕ?

ДА АПОШНЯГА СНЕГА

Як, напэўна, паспеў заўважыць вечна галодны студэнт, на тэрыторыі універсітэцкага гарадка нядаўна з'явіўся прывабны кіёск з апетытнымі шашлыкамі, сасіскамі, кебабамі.

Але студэнт, хоць і галодны, галаву не губляе — натоўпу жадаючых каля кіёску не назіраецца. Чаму? Як лічаць самі гаспадары, студэнт можа завітаць да іх адзін раз у месяц. У дзень стыпендыі. Шашлык з ялавічыны каштуе ў кіёску 125 рублёў, са свініны — 158. Папулярнасцю ў студэнтаў карыстаецца хіба толькі гарачая сасіска з булачкай — 50 рублёў і кетчуп да яе — 10 рублёў за порцыю.

Сапраўднай перашкодай на шляху да абагачэння стаў плот, што аддзяляе кіёск ад больш самавітых кліентаў. І, дарэчы, універсітэт ад табараў цыганоў і іншай залётнай публікі з прывакзальнай плошчы.

І таму, як толькі сыйдзе апошні снег, апетытны кіёск пераедзе на новае месца. Бо абарот грошай у хлопцаў амаль ніякі. Планавалася абслугоўваць за дзень не менеш за тысячу чалавек, а на самай справе атрымліваецца толькі сто (і то я мяркую, нехта з таго боку плота прарываецца). А даводзіцца плаціць за ваду, электраэнергію, ды і зарплата запрамую залежыць ад рэалізацыі колькасці сасісак. Сто рублёў у дзень — ну гэта проста нецікава! Хоць і лічаць гасцінныя гаспадары кіёску студэнтаў самымі прыемнымі і прывабнымі кліентамі.

Вольга УЛЕВІЧ.

АТРЫМАЙЦЕ — РАСПІШЫЦЕСЯ

СТЫПЕНДЫЯ АД ДЗЯДЗЬКІ ДЖОНА

Брытанскі Савет, які садзейнічае развіццю супрацоўніцтва Вялікабрытаніі з іншымі краінамі ў галіне культуры, адукацыі, тэхналогіі і навукі, аб'явіў конкурс на выдзяленне стыпендый на 1993—1994 год. Цэнтрам па распаўсюджанні інфармацыі і зборы заяў кандыдатур стаў наш універсітэт.

Больш падрабязную інфармацыю прадставіў карэспандэнту «Беларускага універсітэта» **Юрый ЧАБАТАРОЎ**, намеснік начальніка ўпраўлення па замежных сувязях:

— Кандыдат на атрыманне стыпендыі павінен мець вышэйшую адукацыю і дасканала валодаць англійскай мовай. Астатнія крытэрыі адбору вядомыя толькі прадстаўнікам Брытанскага Савету. Нягледзячы на ўсе гэтыя акалічнасці, жадаючых прыняць удзел у конкурсе шмат, мяркуючы па тым, што з 4 сакавіка па 11 болей за сто чалавек звярнуліся за анкетамі.

— А што ўяўляе сабой стыпендыя Брытанскага Савету?

— Гэта год стажыроўкі ў Англіі: бясплатнае навучанне, праезд у абодвы бакі, карыстанне бібліятэкамі і навуковым абсталяваннем, харчаванне, напэўна, кішэнныя грошы — поўнае забеспячэнне.

— Наколькі я магу здагадвацца, пад час такой стажыроўкі стыпендыяты прадастаўляюцца выключныя магчымасці займець выгадныя кантракты ў Англіі ці ўладкавацца на працу?

— Не. Умовы стажыроўкі такія, што пасля заканчэння яе тэрміну стыпендыят абавязкова пакідае краіну знаходжання.

На стыпендыю не прэтэндавала студэнтка Вольга УЛЕВІЧ.

МЫ — РЭСПУБЛІЦЫ

ЁСЦЬ І ТАКІ ЦЭНТР

Выявіць у вадзе хлорарганічныя злучэнні, шкодныя для чалавечага арганізму, можна з дапамогай арыгінальнай методыкі, якую распрацавалі супрацоўнікі кафедры аналітычнай хіміі і НДІ фізіка-хімічных праблем Белдзяржуніверсітэта.

Яны займаюцца атэстацыяй пітной вады ў Маскоўскім раёне Мінска. Вынікі іх даследванняў дапамогуць не толькі «масквічам», але і жыхарам Кастрычніцкага і Цэнтральнага раёнаў сталіцы, другіх рэгіёнаў рэспублікі, якія выкарыстоўваюць хларыраваную ваду.

Супрацоўнікі інстытута і кафедры вывучаюць таксама і ўтрыманне розных хімічных рэчываў у мінералах і глебе, сплавах і прадуктах харчавання. Іх паслугамі карыстаюцца медыкі і крыміналісты, работнікі сельскай гаспадаркі і экалогі. Але нават яны не ведаюць, што звяртаюцца за дапамогай у Рэспубліканскі хіміка-аналітычны цэнтр. Юрыдычна яго пакуль не існуе, а фактычныя функцыі цэнтр выконвае ўжо сёння.

Без хіміка-аналітычнага цэнтра сёння не абыйсціся. І не толькі таму, што нельга больш спадзявацца на чысціню глыбінных падземных крыніц пітной вады. Цэнтр неабходны перш за ўсё нацыянальный прамысловасці для падрыхтоўкі супрацоўнікаў вытворчых аналітычных лабараторый. Раней гэтым займаліся ліквідаваныя цяпер галіновыя інстытуты саюзнага значэння. Цяпер жа месячная стажыроўка для атрымання першапачатковых навыкаў работы на храматографе ці атамна-абсорбцыённым спектрометры абыходзіцца ў Расійскіх цэнтрах у сто тысяч рублёў.

А каб набыць спецыялізаваную лабараторыю для аналізу прадуктаў харчавання патрабуецца ад аднаго да трох мільёнаў долараў.

Існаванне рэспубліканскага хіміка-аналітычнага цэнтра са штатам высокакваліфікаваных супрацоўнікаў і неабходным абсталяваннем дапаможа пазбегнуць вялікіх выдаткаў і самастойна вырашыць многія праблемы эканомікі, навукі і медыцыны.

Вераніка БЯГУН, Белінфарм.

САКРЭТ ФІРМЫ

НАВУКА ПАЧАКАЕ

Навука нясе страты ў галіне распрацовак, ідэй, і, што самае крыўднае і незаменнае, людзей.

Болей за 200 кандыдатаў навук пакінулі ў мінулым годзе Беларускую Акадэмію навук. Вызваленыя месцы занялі толькі 80 чалавек.

Па словах старшыні мінгарвыканкома Герасіменка, у гэтым годзе праводзілася апытанне сярод студэнтаў і мала дых вучоных. Застацца працаваць у рэспубліцы згадзіліся толькі 60 працэнтаў матэматыкаў, 50 — фізікаў, 40 — інфарматыкаў.

• • •

ЗАМЕЖНІКІ ЗАХАПІЛІ МАСКВУ

Некалькі тысяч азіятскіх, афрыканскіх і лацінаамерыканскіх студэнтаў у бліжэйшы час наведаюць сталіцу. Яны прыедуць з Узбекістану.

Нядаўна ўлады гэтай рэспублікі заявілі, што намерваюцца перайсці на кантрактную сістэму навучання. Але урады дзяржаў, чые студэнты навучаюцца ў Узбекістане, плаціць адмовіліся. І тады ўсіх замежных студэнтаў вырашылі адправіць у Расію. Таму што абавязацельствы па бясплатнаму навучанню браў на сябе СССР, а Расія праваераемнік Саюза. Як вырашыцца гэтая праблема — пакуль невядома.

ТВОРЧЫ ПРАКТЫКУМ

КАЛІ НІШТО ІНШАЕ НЕ ДАПАМАГАЕ, НАМАЛЮЙЦЕ, НАРЭШЦЕ, КЛЯКСУ

У пятніцу ён прачнуўся з неверагоднай думкай — прайсці скрозь шэрую сцяну свайго пакоя і апынуцца дзе-небудзь на Паўночным полюсе. Аднак ён нават не зварухнуўся, бо цвёрда ведаў, што на самай справе такога не бывае. Таму, саступіўшы з ложка, увайшоў у абрыдлую штодзённасць.

Так. Звычайны чалавек імкнецца нікому не распавядаць пра свае маленькія адкрыцці. Навошта шумець? Дарэчы, пра шум: у сапраўднага вынаходніка не знікае без карысці нават шум — галандская фірма «Філіпс» ужо выпускае святлафоры, якія маюць акумулятары, што зараджаюцца ад вулічнага шуму. Стаць вынаходнікам, як ні дзіўна, можа кожны.

ЁСЦЬ ТАКАЯ ТЭОРЫЯ

«Вучоныя сцвярджаюць, што ўсе вынаходніцтвы залежаць ад выпадку, настрою, саставу крыві... Мяне гэта не магло задаволіць. І я вырашыў: калі гэтай тэорыі няма — значыць, яе трэба стварыць!» — Генрых Альтшулер, аўтар тэорыі рашэння вынаходніцкіх задач (ТРВЗ).

Генрых Альтшулер звярнуў увагу на надзвычайнае падабенства, здавалася б, зусім розных вынаходак. У сваёй кнізе «Знайсці ідэю» ён выказаў думку пратое, што няма розных вынаходак, ёсць адна Вынаходка, розныя бакі якой праяўляюцца ў прыватных тэхнічных рашэннях.

Работу па стварэнню тэорыі Альтшулер распачаў яшчэ ў сярэдзіне саракавых гадоў. Першая публікацыя з'явілася ў 1956 годзе, першая кніга — у 1961.

У Мінску ўжо некалькі гадоў працуе лабараторыя вынаходлівых машын, якая створана на базе гарадской школы ТРВЗ, што існуе з 1976 года.

Тэорыя Альтшулера распачалася з вывучэння сусветнага патэнтнага фонду. Тэорыя грунтуецца на двух асноўных палажэннях: тэхнічныя сістэмы развіваюцца праз узнікненне, абвастрэнне і вырашэнне супярэчнасцей. А падобныя супярэчнасці пераадольваюцца падобнымі прыёмамі.

Чым адрозніваецца «трызавец» ад звычайнага чалавека? Ён не баіцца супярэчнасцей, ён іх шукае, ён сам імкнецца да іх.

І БЫЦЬ, І НЕ БЫЦЬ

А зараз трошкі аб супярэчнасцях. Мастак Кранах-малодшы, даведаўшыся пра тэорыю, знайшоў бы рашэнне сваёй праблемы імгненна. Справа ў тым, што ён атрымаў заказ напісаць партрэт кардынала Брандэрбургскага — аднаго з людзей, якія наводзілі страх на сучаснікаў. Кардынала трэба было намаляваць у яго кабінеце з Бібліяй і крыжом. Мастак сутыкнуўся з праблемай: напісаць кардынала такім, які ён ёсць, нельга, але і пайсці супраць свайго сумлення таксама нельга. І што ж? У выніку твар кардынала выглядае прыгожым. Але постаць Хрыста, на якую ён глядзіць, вартая жалю і спалохана курчыцца ад позірку жудаснага чалавека.

НАТХНЯЙ СЯБЕ САМ

«У чалавека моцны стымул да творчасці. Гэтым ён адрозніваецца ад малп, ад кабаноў, ад тыграў, ад астатніх жывёл. Тым галоўнае — пад'есці, у чалавека яшчэ цікаўнасць ёсць»,— Генрых Альтшулер.

Тым, хто жадае быць творцай, прапануецца тэорыя развіцця творчай асобы (ТРТА), таксама распрацаваная Альтшулерам. Каб развіць творчыя здольнасці, чалавеку перш за ўсё трэба выбраць Дастойную Мэту. Існуюць нават крытэрыі: мэта павінна быць новай, карыснай для грамадства, канкрэтнай, значнай, ерэтычнай. А адзін з метадаў выяўлення сваёй мэты — калекцыяніраванне. Напрыклад, англічанін Уілсан Бэнтлі збіраў фотаздымкі сняжынак і даказаў, што ў цэлым свеце не знойдзеш дзвюх аднолькавых.

На конкурс, абвешчаны часопісам «Парус» некалькі год таму, прыйшлі прапановы калекцыяніраваць прычыны сямейных спрэчак, уражанні ад музыкі і нават усмешкі.

У Вялікіх можна заўважыць некалькі падобных якасцей, якія іх і вылучаюць сярод людзей звычайных. Акрамя мэты, гэта вялікая працаздольнасць, сістэма планаў і праграм набліжэння мэты і сістэма кантролю, уменне «трымаць удар», выніковасць, хаця б прамежкавая. А вылучаныя падабенствы паводзін Вялікіх у моманты «ўдараў лёсу» і паслужылі нагодай для стварэння жыццёвай стратэгіі творчай асобы (ЖСТА).

Мажліва, проста нараджаюцца людзі геніяльныя і звычайныя?

ПРАВЕРКА НА ГЕНІЯЛЬНАСЦЬ

«...аказваецца, што геніяльнасць зусім не такі ўжо боскі падарунак, што яна... складае лёс кожнага, хто не народжаны зусім ідыётам»,— П. К. Энгельмейсер, адзін з першых тэарэтыкаў творчасці.

— Што такое геніяльнасць? Гэта ацэнка дзейнасці чалавека будучымі пакаленнямі,— гавораць «трызаўцы».— Як людзі абвяшчаюцца геніяльнымі? Вельмі проста. Адзін з прыкладаў: уявіце сабе ненаселены востраў са схаваным скарбам. Шмат хто яго шукаў. Нічога не знайшлі. Засталося праверыць у адным толькі месцы. Прыходзіць звычайны чалавек і капае. Зразумела, скарб знаходзіць і... абвяшчаецца геніяльным.

— Мікалай Мікалаевіч,— пытаюся я ў вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі вынаходлівых машын М. М. Хаменкі,— а чым дрэнны метад спроб і памылак? Ці не адбірае тэорыя ў чалавека радасць самога працэсу пошуку?

— Усялякая творчасць на нейкім этапе ператвараецца ў рамяство, а далей з'яўляецца імкненне да новай творчасці. Тэорыя не адбірае ў чалавека радасць пошуку, а толькі дапамагае яму шукаць у правільным накірунку.

Аднак існуюць такія задачы, якія трэба вырашаць хутка, і не спадзявацца на натхненне.

І НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕЛЯ ЗАБАВЫ

Тэорыя рашэння вынаходніцкіх задач універсальная, таму што з яе дапамогай можна ствараць новыя методыкі. Зараз ужо распрацоўваюцца новыя напрамкі ТРВЗ плюс. Плюс педагогіка, сацыялогія. Выдаюцца часопісы, кнігі, праводзяцца семінары. Больш за ўсё мяне ўразіла методыка стварэння...



Чаго вы думаеце? Забаў! А яшчэ распрацавана сістэма развіцця рухомых гульняў, прапануюцца прыёмы прадумвання казак. Гэта ўсё азначае, што тэорыю даўно імкнуцца прыстасаваць і на нетэхнічных абсягах. Спецыялісты па ТРВЗ праводзяць кансультацыі розных фірм па пытаннях арганізацыі, прагназіравання развіцця фірм. А сам Альтшулер, акрамя ўсяго, займаецца прагназіраваннем праблем XXI стагоддзя і іх вырашэннем.

ДАЗВОЛЬ САБЕ ЎЯВІЦЬ

«— Гэта белы мядзведзь, які ідзе ў поўдзень па распаленых пясках Каракумаў. Ён у тапках, якія яму малыя.

— Чаму белы мядзведзь, і ў пустыні? — пытаецца збіты з панталыку слухач.— Чаму белы мядзведзь, клякса ж цёмна-сіняя!

— Белы мядзведзь,— цвёрда паўтарыў я.— Ён пацямнеў ад загару. У пустыні моцнае сонца.

— А тапкі? — з адчаем выпаліў слухач.— Дзе вы бачыце тапкі?!

Я наўдачу тыцнуў у кляксу:

— Тут.

— Але ж тут дзве лініі сыходзяцца ў адну...

— Гэта дзве нагі ў адным тапку, таму і цісне».

Гартаючы кнігі Альтшулера, я звярнула ўвагу на гэты незвычайны дыялог. На пытанні слухача адказвае сам Альтшулер. Размова ідзе пра кляксу Роршаха. Гэта такі тэст, калі на белы аркуш паперы наносіцца чарнільная клякса. Трэба паглядзець і адказаць, што яна нагадвае. Лічыцца: чым больш арыгінальным будзе параўнанне, тым мацнейшая фантазія.

Генрых Альтшулер, дарэчы,— вядомы пісацель-фантаст Генрых Альтаў. І самае цікавае, што свае раманы ён піша з дапамогай сваёй тэорыі.

Галоўнае — упэўненасць у сваіх сілах. Так, калі вы ў чацвер устанеце з левай нагі і за ўвесь дзень вам не прыйдзецца сказаць ніводнага дрэннага слова,— малюйце кляксу і спакойна можаце праходзіць скрозь усе сцены ў пятніцу ў поўдзень. Прыемнага падарожжа.

Таццяна КАЗАК.

НА ЗДЫМКУ: мастак К. Гарэцкі.

Фота В. ФЯДОСЕНКА.

МАСЛЮКОЎ

ПРЫМАЕ ГАСЦЕЙ

НА СЦЭНЕ — АДЭСА, ПЕЦЯРБУРГ І МІНСК

Апошнімі днямі жыццё ўдзельнікаў КВЗ вельмі неспакойнае: верцяцца як вавёркі ў каляскіцы. Зусім хутка яны ад'язджаюць у Маскву, а на апошняй рэпетыцыі, як заўсёды, не стае часу. Аднак мне пашчасціла з адным-другім перамовіцца.

Мэту свайго візіту у белакаменную сфармулявалі так: «Былі ў Варонежы на фестывалі Маслюкова. Трапілі ў рэгулярны сезон. Едзем далей гуляць...»

Неафіцыйны прэс-аташэ каманды **Саша ГАЎРЫЛЬЧЫК** заўважыў:

— Хоць фестываль — гэта больш шоу, але ад выступлення на ім шмат што залежыць. Менавіта трапіць каманда ў рэгулярны сезон ці не.

Калі памятаеш, наша выступленне на аналагічным фестывалі ў Цюмені было першым і апошнім у клубе Маслюкова. Па гэтым часе падобная перспектыва нас не задавальняла, таму мы старанна рыхтавалі сваю праграму: у Варонежы штодзённа працавалі па 12 гадзін. На ўсё астатняе заставалася толькі ноч.

Фестываль даволі прадстаўнічы. Каго там толькі ні было: шпана з Крывога Рога, гуверн[illegible]кі з Сарата[illegible]ва, днепрапятроўскія эратаманы. Наш імідж быў — паляўнічыя. І мы трапілі ў запаветную шасцёрку фіналістаў, якая выступіць у рэгулярным сезоне КВЗ. Нашы сапернікі — адэсіты, піцерцы, хлопцы з Баку, дзяўчаты з Навасібірска і аб'яднаная каманда Данецкага і Уральскага політэхнічных інстытутаў!

Калі меркаваць па выказваннях мясцовай прэсы — наша каманда варонежцам спадабалася. Нават сам Маслюкоў у інтэрв'ю «Нядзелі» сказаў пра нас добрыя словы.

...Упершыню беларуская каманда заваявала ў КВЗ сваё месца пад сонцам. Будзе першы блін комам ці не — хутка даведаемся. За плячыма сапернікаў — адэскіх джэнтльменаў і піцерскіх эканамістаў-фінансістаў — не адзін сезон выступлення у клубе КВЗ. Аднак досыць песімістычных думак! У паўфінал выходзяць дзве каманды. Зусім неабавязкова, каб трэцяй лішняй была каманда КВЗ Белдзяржуніверсітэта.

Аляксандр ЮРЫН.

П. S. Чвэрцьфінальная гульня адбудзецца 20 сакавіка. Яе тэма «Малыш і Карлсан» прысвечана 25-годдзю выхаду кнігі.

ЖАРТАЧКІ!

ПА КРОПЛІ ВЫЦІСКАЮЧЫ РАБА...

Кожная прафесія накладвае адбітак на характар і паводзіны, выпрацоўвае псіхалагічныя стэрэатыпы. Не пазбаўлены гэтага і педагогі.

Вытокам псіхалагічных комплексаў педагогаў з'яўляецца, як ні дзіўна, грамадская значнасць, грамадская незамкнёнасць іх працы. Да гэтага дадаецца неабходнасць пастаяннага дыдактызму ў прафесійных паводзінах.

Практыкі-настаўнікі не дадуць схлусіць: размова аб нейкай дапушчальнай свабодзе, «дэмакратычнасці» паводзін настаўніка сярод вучняў — рэч даволі ўмоўная. Прытожыя тэарэтызаванні — адно. А канкрэтная дзейнасць — зусім іншае. Існуе шмат прыкладаў, калі прагрэсіўны малады выпускнік ВНУ, ладужа паверыўшы ў неабходнасць «на роўных» быць з вучнямі, губляў элементарную здольнасць выкладаць на ўроках. Тут шмат ёсць прафесійных хітрыкаў, якія, на жаль, кожнаму даводзіцца спасцігаць самастойна. Пэўная псіхалагічная дыстанцыя «я — вучні» ствараецца настаўнікамі з простай неабходнасці самазахавання псіхікі. Гэта не ад творчай ляноты. Ад перагрузкі над час работы. Бо і 18 гадзін на тыдзень для сапраўды творчай штомінутнай педагагічнай работы — нагрузка вельмі значная. З дня ў дзень, з тыдня ў тыдзень, з месяца ў месяц псіхалагічная гульня-змаганне з такой жывой, гнуткай, непрадказальнай, бурлівай, хітраватай дзіцячай псіхікай... Колькі можна вытрымаць арганізм? Год, тры, пяць?..

І калі настаўнік-мужчына ў гэтым сэнсе можа дазволіць сабе большую свабоду як істота больш моцная ў фізічным сэнсе, то жанчыне дыстанцыю з вучнямі прыходзіцца трымаць больш жорстка. У мэтах самазахавання і эканоміі псіхікі адбываецца своеасаблівае замацаванне, крышталізацыя дыстанцыі. Гэтую з'яву можна параўнаць з падобным у медыкаў: «Нельга кожнага шкадаваць, каго прывезлі ў бальніцу, іначай не вытрымае сэрца». І ў іх з'яўляецца эфект псіхалагічнага адчужэння ад пацыента. Гэта зразумела — яны павінны выконваць свае прафесійныя абавязкі дзесяткі год.

Набыты навык «дыстанцавання» становіцца паступова другой натурай педагога. І адбываецца даволі сумная рэч. Замацаваная дыстанцыя ва ўзаемінах абагульняецца, пашыраецца, выходзіць за межы школы, за межы прафесійнай дзейнасці. Дыстанцыя крышталізуецца ў сістэме «я — іншы чалавек». А гэта ўжо псіхалагічны комплекс, які даволі значна адбіваецца на ўзаемінах з іншымі людзьмі. Колькі пацярпела жанчын-педагогаў ад гэтага свайго прафесійна набытага комплексу ў прыватным жыцці, у яго наладжванні, у будаўніцтве свайго асабістага шчасця!

Пастаянная неабходнасць у педагагічнай дзейнасці даваць маральныя ацэнкі, выводзіць мараль, падзяляць учынкі на добрыя і дрэнныя пераходзіць у жыццё з яго бязмежнай складанасцю, дзе, здараецца, знешні выкгляд паводзін не супадае з унутраным зместам, і дзе лінейны, дыдактычны падыход абавязкова з'яўляецца памылковым.

З аднаго боку навык дыстанцыі прымушае жанчыну-педагога ў жыцці ўвесь час азірацца на сябе, «трымаць у рамках». З другога — набытая бактэрыя дыдактызму прымушае ў жыцці рабіць пастаянна адназначную ацэнку ўчынкам, займацца маралізатарствам, якое не заўсёды да месца... Так узнікае той самы вобраз «сіняй панчохі».

А дададзім да гэтага іншыя больш «матэрыяльныя» настаўніцкія комплексы: немагчымасць добра апрануцца, рэгулярна наведваць тэатры, канцэрты, іншыя краіны і гарады, набываць неабходныя кнігі, абвостраная жыллёвая праблема. Гэтыя комплексы не даюць педагогу па-за школай выйсці ў поўнай меры са стрэсу.

Як пазбаўляцца ад комплексаў?

Па-першае, пра іх ведаць і крытычна, а лепш за ўсё з гумарам да іх ставіцца. Адно можна сказаць зусім дакладна: шчасце чалавечае залежыць ад таго, наколькі чалавек у стане зрабіць сябе Свабодным Чалавекам, гнуткім у жыццёвых абставінах.

Трэба пастаянна выходзіць з-пад улады догмаў, фразформул, ацэнак стэрэатыпаў — да вышынь сапраўднай чалавечай свабоды, адухоўленасці, да таго псіхалагічнага распрыгоньвання, якое толькі і годнае для шчаслівага чалавека. Шлях да гэтага цяжкі. Але ён таго варты.

І. СОТНІКАЎ.

НАВІНЫ МЕДЫЦЫНЫ

КАЛІ ХОЧАШ БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ ЗАСТРАХУЙСЯ . У «БЕЛАРОСНО»

Аказваецца, не такі страшны чорт, як яго малююць.

Семдзесят гадоў нас пужалі рабаўніцкімі цэнамі платнай медыцыны ў буржуазным грамадстве, пастаянна падкрэсліваючы перавагу сацыялістычнай аховы здароўя. Аднак як толькі з'явіліся ў нас першыя «парасткі» капіталізму ў белых халатах — страхавыя медыцынскія арганізацыі — дык спрадвечная боязь і пачала развейвацца. Асаблівую папулярнасць і давер у жыхароў Беларусі заваявала страхавое народнае таварыства «БЕЛАРОСНО», кліентамі якога цяпер з'яўляюцца не толькі сотні грамадзян, але і цэлыя працоўныя калектывы шэрагу буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі.

С дырэктарам «БЕЛАРОСНО» **Віктарам КАЛОДКІНЫМ** *гутарыць* **Мікола ДЗЯБЕЛА.**

— Віктар Уладзіміравіч, як у вас атрымалася за тры месяцы з моманту пачатку дзейнасці «БЕЛАРОСНО» запэўніць некалькі сотняў людзей, якія выраслі пры сацыялізме, у пераважнай капіталістычнай страхавой медыцыны? Тым больш, што вашы паслугі не такія ўжо і танныя, пэўна?

— Пачну з адказу на апошняе пытанне. На сённяшні дзень кошт нашага страхавога поліса складае ад 10 да 30 тысяч рублёў у год. Да прыкладу, калі вы хочаце мець асабістага ўрача, які б на працягу года сачыў за вашым самаадчуваннем, для гэтага дастаткова набыць у нас страхавы поліс за 10 тысяч рублёў і — да вашых паслуг мы адшукаем лепшага ў Мінску тэрапеўта, хірурга, педыятра ці акуліста. Стацыянарнае лячэнне ў самых сучасных клініках Беларусі каштуе даражэй — каля 30 тысяч рублёў. Прычым, што датычыць страхавога полісу на стацыянарнае лячэнне, дык калі вы яго не скарыстаеце — атрымаеце назад 90 працэнтаў сваёй страхоўкі. Атрымліваецца, што страхавая медыцына прымушае чалавека беражліва ставіцца да ўласнага здароўя. Паколькі за яго заплочаны грошы — хварэць — справа недарэчная. У гэтым, між іншым, і адзін з сакрэтаў поспеху нашай хуткарастучай папулярнасці. Хаця кліенты «БЕЛАРОСНО» не ў накладзе нават тады, калі іх спасцігае якая-небудзь хвароба. Мы супрацоўнічаем з лепшымі ў рэспубліцы спецыялістамі ва ўсіх галінах медыцыны, а ў выпадку неабходнасці знойдзем для кліента высокакласнага ўрача і за межамі Беларусі, заключым з ім дагавор. Больш таго, у нас створаны інстытут экспертаў, якія кантралююць работу урачоў, што лечаць нашых кліентаў. Гэтая падстрахоўка дазваляе да нуля звесці памылкі пры ўстанаўленні дыягназу і лячэнні.

І яшчэ. У распаддарджэнні «БЕЛАРОСНО», акрамя высокакласных спецыялістаў, маецца сучаснае медабсталяванне, эфектыўныя прэпараты і медыкаменты, якія мы самі набываем у краінах бліжняга замежжа. Таму да нас часта звяртаюцца людзі з беларускай правінцыі, дзе ўзровень медыцынскага абслугоўвання, як вядома, ніжэй, чым у сталіцы, а тэхнічная аснашчанасць бальніц і клінік зусім у бядотным становішчы. Мы ўжо застрахавалі сотні людзей у рэспубліцы на агульную суму больш як 10 мільёнаў рублёў, ды плюс заключаныя дагаворы медыцынскага страхавання на суму 5 мільёнаў рублёў. Сярод нашых кліентаў цэлыя працоўныя калектывы прадпрыемстваў Жодзіна, Ліды, Баранавічаў, кіраўнікі якіх праявілі сапраўдны клопат аб здароўі сваіх работнікаў.

— Калі не сакрэт, куды ўкладваецце вы грошы застрахаваных?

— Асноўны прынцып страхавой медыцыны мы разумеем так: багаты плаціць за беднага, здаровы — за хворага. Што гэта азначае?

Нашы індывідуальныя кліенты людзі па сённяшніх мерках добра забяспечаныя, працоўныя калектывы — таксама не з апошніх. Укладзеныя нашымі страхавацелямі грошы, зразумела, ідуць у абарот, а потым немалую частку атрыманага прыбытку мы выкарыстоўваем на дабрачынныя мэты — аказваем бясплатную дапамогу маламаёмым, набываем і для іх лекі. Да таго ж, праз чатыры гады нашы пастаянныя кліенты атрымліваюць бясплатны страхавы поліс.

Нейкая частка сродкаў ідзе на развіццё нашай матэрыяльна-тэхнічнай базы — на развіццё вытворчасці, а таксама непасрэдна на аплату работы медперсаналу. У нас, дарэчы, урач атрымлівае 30—40 тысяч рублёў у месяц, што ў два разы больш, чым у дзяржаўных медустановах. Таму працуюць усе самаддана, месца трымаюцца, бо канкурэнцыя вельмі высокая. Не дзіўна, што калі мы набіралі штат асабістых урачоў, дык на 15 вакансій было пададзена 200 заяў.

— Віктар Уладзіміравіч, ці не баіцеся вы, што калі наша дзяржаўная медыцына стане платнай, значна ўзніме ўзровень абслугоўвання, набудзе высокаэфектыўнае абсталяванне, «БЕЛАРОСНО» і падобныя на яго таварыствы застануцца без работы?

— Беспрацоўе нам не пагражае. Ні цяпер, ні тым больш пры адносна развітым капіталізме на Беларусі. Калі ўсе нашы медустановы змогуць гарантаваць сваім пацыентам высокакваліфікаваную дапамогу, мы будзем толькі радавацца. Нам хопіць пасрэдніцкай работы па дапамозе людзям знайсці выдатнага спецыяліста, прасачыць за якасцю лячэння. Акрамя таго, мы маем унікальныя матэрыялы даследавання стану здароўя насельніцтва рэспублікі, на падставе якіх можам спрагназіраваць пагрозу захворванняў людзей тых ці іншых рэгіёнаў рэспублікі. Мы зможам весці прафілактыку. Словам, работы ў нас многа і канкурэнтаў мы не баімся ні з боку дзяржавы, ні сярод сваіх калег. Людзі вераць нам, а мы робім усё магчымае для падтрымання сваёй рэпутацыі.

— Як можна набыць страхавы поліс вашай кампаніі?

— Ніякіх праблем! Звяртайцеся да нашага страхавога агента па тэлефоне 20-30-14 ці па адрасу: Мінск-129 а/я 183 і станеце нашым кліентам, а значыць набудзеце ўпэўненасць у заўтрашнім дні.



ВУЧЫЦЦА — НЕ ВУЧЫЦЦА

У КІШЭНІ «МАЛЬБАРА» І ПАЧАК ГРОШАЙ? ДЫПЛОМ НЕАБАВЯЗКОВЫ

Адзін знаёмы, правучыўшыся калісьці год у ваенным вучылішчы, падаўся ў бізнес, не зусім законны, праўда. Затое мае які-ніякі, а дастатак. Пачуўшы, што я ўсё яшчэ студэнт, з жаласлівай усмешкай кінуў: «Вучыся, вучыся!» А больш сур'ёзна дадаў: «Цяпер не інстытуты, а жыццё ўсяму вучыць і выдае свае дыпломы, з якімі толькі і можна пажыць...»

Не стаў я пярэчыць. Няхай лепей адкажуць яму тыя, хто праз месяц-другі атрымае дыплом. Што яны могуць сказаць у сваё «апраўданне» з вышыні пяці студэнцкіх гадоў?

— ЮРЫЙ, студэнт факультэта фізікі і інфарматыкі МДПІ:

— Няўпэўненасць у тым, ці патрэбна вышэйшая адукацыя, будзе нядоўгай. Калі мы імкнемся ва ўсім быць падобнымі на Захад, то павінны прыйсці і да разумення сапраўднай цаны добрых ведаў. А пакуль грошы можна браць голымі рукамі, пакуль няма розніцы паміж кваліфікаваным і некваліфікаваным спецыялістам — аб вышэйшай адукацыі мала хто задумаецца.

Аднак інстытут — не вучылішча, дзе даюць толькі пэўную прафесію. ВНУ прапануе чалавеку не толькі рознабаковыя веды, але і магчымасць пашырыць інтэлектуальны патэнцыял. Хаця сёння можна няблага жыць без усяго гэтага, забяспечыўшы сябе матэрыяльна. Але ж жыццё — гэта не толькі грошы...

ІГАР, студэнт гістарычнага факультэта БДУ:

— У апошні час для многіх ідэал — крутыя хлопцы ў «камках» з «Мальбара» і пачкам грошай у кішэні. Для такіх вышэйшая адукацыя і сапраўды падаецца справай другараднай. Рабіць грошы — у гэтым сутнасць іх жыцця.

Такая з'ява незразумелая для нармальнага грамадства, але толькі не для нашага, бо універсітэцкі дыплом у нас ніколі не быў у пашане. Яшчэ дзесяткі год таму, калі прымалася, здаецца, другая праграма партыі, было заяўлена: служачы рабоча-сялянскай дзяржавы не павінен атрымліваць больш за сярэдні заробак рабочага.

Але насуперак падобным акалічнасцям паступіць у ВНУ было ганарова заўсёды. Не тое, што цяпер. Раней ведалі, што разам з дыпломам атрымаюць і работу, што за вучобу не давядзецца плаціць, што адны і тыя ж выкладчыкі не будуць сёння сцвярджаць адно, а назаўтра другое, зусім процілеглае, што...

Аднак, якія б хібы ні былі ў сістэме навучання (нам раяць добра ўзяцца за вывучэнне замежных моў і тут жа скарачаюць тэрмін іх выкладання з трох да двух гадоў), у нас можна атрымаць добрую адукацыю. Але ж дзеля гэтага трэба больш спадзявацца на ўласныя сілы і праяўляць дадатковую цікавасць да вучобы. Лекцый і семінараў можа хапіць, максімум, на атрыманне чырвонага дыплома. Хаця твайго будучага вучня не будзе цікавіць, ці ёсць у цябе дыплом і якога ён колеру.

А ўвогуле, вышэйшая адукацыя — гэта не толькі дыплом, у большай ступені гэта форма мыслення, якая склалася за пяць студэнцкіх гадоў.

Магу запэўніць, што Юра і Ігар былі шчырыя ў сваіх словах — добра ведаю іх яшчэ са школы. Не сумняваючыся ў прафесійных здольнасцях, веру ў іх паспяховую настаўніцкую кар'еру, якая, рана ці позна, адпаведна забяспечыць іх жыццё і ў матэрыяльным плане.

А. ЮРЫН.

АПТЭКА

АД БРАНХІТАЎ І КАЛІТАЎ ДАПАМОЖА ФІРМА «ФІТА»

МЫ ЎСЁ МЕНШ ДАВЯРАЕМ ХІМІЧНЫМ ПРЭПАРАТАМ. ДА ТАГО Ж, НЕ ПЕРШЫ ДЗЕНЬ МЕДПРЭПАРАТЫ Ў ШЭРАГУ УСТОЙЛІВЫХ ДЭФІЦЫТАЎ. А ХВАРОБЫ, НА ЖАЛЬ, ПАДПІЛЬНОЎВАЮЦЬ НАС УСЁ ТАК ЖА ЧАСТА. ЁСЦЬ ВЫЙСЦЕ — УСПОМНІЦЬ ДАЎНО ЗАБЫТЫЯ СТАРЫЯ РЭЦЭПТЫ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ.

АНГІНУ

можна вылечыць за суткі, пажаваўшы свежую смалу яліны.

КРЫВЯНЫ ЦІСК

панізіцца, калі сцягнуць на некаторы час нешырокім бандажом вялікі, указальны і трэці пальцы абедзвюх рук.

АД ГАЛАЎНОГА БОЛЮ

вызваліць энергічнае расціранне паміж вялікім і ўказальным пальцамі абедзвюх рук. Калі болі ўзнікаюць часта — націскайце на вузлы, што звязваюць пальцы з кісцю рукі.

Вы не будзеце пакутваць на РАДЫКУЛІТ,

калі цёртую бульбу (сырую, з лушпінем), змешаную з роўнай колькасцю бензіна, прыкласці на марлі на паяснічна-крэсцовую вобласць на 10—15 хвілін.

БЯССОННІЦА

адступіць, калі перад сном будзеце зажымаць у замок пальцы абедзвюх рук так **моцна**, як толькі можаце на працягу 10 хвілін. Масіруйце перадплечча металічнай шчоткай 5—10 хвілін. Лежачы, моцна націсніце на пераноссе вялікім і ўказальным пальцамі.

АДКЛАДЫ СОЛЕЙ

у пятках рассасуцца, калі на працягу 2—3 месяцаў 5—8 разоў кожны дзень будзеце хадзіць па дробных каменьчыках, пакладзеных у баваўняны мяшок.

ДА ХВОРЫХ КАЛЕНЯЎ

трэба прыкладваць лісты свежай капусты ці лопуху. Праз паўгода такога лячэння вы забудзецеся на боль.

ГЛІСТОЎ

можна вывесці настоем цыбулі. Для гэтага цыбулю трэба разрэзаць, пакласці ў кубак з вадой на ноч. Раніцой добра адціснуць кавалак цыбулі ў ваду і выпіць нашча. Курс лячэння 2—3 дні.

Усім, КАМУ ЗА СОРАК,

рэкамендуецца штодзень есці кашу, якая добра ўздзейнічае на косці, страўнікавы і кішэчны тракты.

Рэцэпт: 2 сталовыя лыжкі вотруб'я запарыць кіпенем, дадаць чайную лыжку мёда і арэхі. ізюм, цёртую курагу, яблык. Есці раніцой замест снядання і пасля вячэры.

КАБ ВАШЫ ДЗЕЦІ РАСЛІ

хутчэй давайце ім цёплае малако з сырымі яйкамі. На 2 кубкі малака — адно яйка. Піць тры разы на дзень.

Н. В. КРАСІЛЬНІКАВА,
урач.

ЦІ ЗАЎСЁДЫ КАРЫСНЫЯ ЛЕКАВЫЯ РАСЛІНЫ?

Шкоду, а не карысць можа прынесці бескантрольнае карыстанне гарбатай з дабаўленнем лекавых раслін, вытворчасць якіх пачалася на некаторых прадпрыемствах.

Фітатэрапеўты з Кіева — супругі Зубіцкія — пасля публікацыі аб карыснасці і лячэбных якасцях зверабою, які многія людзі ведаюць і выкарыстоўваюць для лячэння ў выглядзе настоеў, атрымалі звыш 2 тысяч чытацкіх водгукаў. Здавалася б, радавацца такой ўвазе, а яны засмуціліся.

Вось адзін з лістоў: «На працягу двух гадоў піў гарбату з дабаўкай зверабою фабрычнай вытворчасці. Параілі каб вылячыць страўнік. Дапамагло... Але прыйшла яшчэ горшая бяда... Цяпер трэба звяртацца на кансультацыю да сэксапатолагаў».

Такія ж лісты-скаргі былі яшчэ.

У жанчын іншы клопат — пасля доўгатэрміновага ўжывання гэтай травы паявілася валасістасць на твары і нагах.

Для Зубіцкіх такі паварот не з'яўляецца нечаканым. Неабходна ведаць у такіх выпадках у якіх дозах можна прымаць зверабой, каму ён карысны, а каму зусім наадварот. На жаль, на прадпрыемствах, не задумваюцца, калі насычаюць гарбату дабаўкамі з траў. Эфірнае масла гарбаты ўтрымлівае звыш 500 хімічных утварэнняў. І піць яе рэкамендуецца без дабавак, у чыстым выглядзе. А зборы лекавых траў лічыць лекавымі сродкамі і піць, толькі параіўшыся з урачом.

Н. В. КРАСІЛЬНІКАВА,
урач.

З ДНЕМ НАРАДЖЭННЯ, «ВЕТВЕВЦЫ»

У красавіку гэтага года літаратурнаму аб'яднанню «Полоцкая ветвь» споўніцца чатыры гады. Спачатку тры маладыя полацкія паэты Сяргей Агееў, Аляксандр Раткевіч і Аляксандр Суднік, сабраўшыся разам, вырашылі стварыць рускамоўную (у Полацку на той час ужо існавала беларускамоўнае літаб'яднанне «Надзвінне») літгрупу.

Праграмныя тэзісы, распрацаваныя «ветвевцамі», стварылі трывалы падмурак дзеля аб'яднання ўсіх мясцовых паэтаў і празаікаў, што стаялі на зусім розных, часам супрацьлеглых пазіцыях. У сваёй праграме яны дэкларавалі літаральна наступнае: «Еднасць паэтаў не ў ступені іх падабенства, а ў ступені арыгінальнасці. Тое, што нас раз'ядноўвае — з'яднае нас». Час паказаў жыццеўстойлівасць гэтых заяў. За чатыры гады склад Полоцкой ветви» павялічыўся амаль у тры разы.

Праз год пасля моманту ўзнікнення літаб'яднання быў выдадзены першы зборнік «Сумерки». Ужо ў наступным, 1991 годзе, выйшла два аўтарскіх зборніка: лірычны А. Раткевіча «Високосный февраль» і зборнік баек у прозе і пародый П. Нізкоўскага «Чудо в перьях». У мінулым годзе ўбачыў свет другі калектыўны зборнік — «Ладья», а потым першы нумар гісторыка-літаратурнага часопіса «Полоцкий летописец».

Напярэдадні 1993 года «Полоцкая ветвь» набыла афіцыйны статус творчай арганізацыі: была зарэгістравана мясцовым выканкомам, як творчы саюз пісьменнікаў на Полаччыне.

А сёння мы друкуем вершы трох прадстаўнікоў арганізацыі: былога студэнта філалагічнага факультэта БДУ А. Раткевіча, студэнтаў факультэта журналістыкі А. Зайцава і А. Судніка.

Олег ЗАЙЦЕВ

У ДОМА

Хрустят и чавкают морозы,
Пестрит узорами стекло,
На лицах бусинками слезы,
И скулы стужею свело.
Деревья, точно изваянья,
Их тени мерзнут на снегу,
А ветра терпкое дыханье
Вдруг превращается в пургу.
По озеру поземка пляшет,
Ей тучи хмурятся в ответ,
Заря на западе все краше,
Укутал небо алый плед,
Поскрипывают двери глухо,
Скребется в форточку метель,
А там, внутри, тепло и сухо,
И сытный ужин, и постель.

ОБОРОТНИ

Избегая — выбираем,
Только выбрав, — избегаем;
Ну, а с нами все играют,
Потешаются, играя.
Обещанья, что орехи,
Сыплют, градом ударяя:
Нам они одни огрехи
Да прорехи обещают.
Бережно расправив фалды,
Не краснея, не икая,
Залпом выложат нам правду:
— Правды? — есть у них такая!
Червяками, слизняками
Мы зовем их меж собою,
Но живут они веками,
Правя... нашею судьбою.

Александр РАТКЕВИЧ

ОСОЗНАНЬЕ

Скользя по жизни, как по льду,
Однажды осознаю:
нельзя упасть, а упаду —
не ногу поломаю.
Я поломаю, может быть,
без боли зримой,
уменье хрупкое любить
и быть любимым.
Банален мир. Банален я.
Но осознанье вдовье
который раз сразит меня
святою новью.

* * *

Какое счастье обладать
твоей душистою походкой,
твоей настойчивостью
кроткой
и сном твоим, когда опять
ушли в былое неудачи,
исчезли муки беспокойств
и несогласий мягких горсть
последним шелестом и плачем
утихла... Каждый день тогда
украшен маленькой утратой,
наполнен песенности мятой
и по утам скользит нектар
твоих уже покорных взглядов.

Александр СУДНИК

«Ной сделал все, что Господь повелел ему».
Библия. Первая книга Моисеева. Бытие. Глава седьмая.

* * * упала

Упала тьма, как нёбо гроба.
Потоп! Потоп! Ковчег и Ной.
А над развратною Европой —
Волна-волной, волна-волной,
Там суша делится на части,
Как сахар тают города.
А Ной свое вкушает счастье —
Седеют кудри, борода...
Его глаза ласкают строки
Невидимых священных книг:
Не утешение — упреки,
Как раскалённые потоки,
Как лава, катятся из них.
И нет, не волны — чьи-то руки
Бессильно трутся о ковчег:
не буря — хрип предсмертной муки,
А может стонет человек?
Нет. Тоже волны.
Чур! Довольно! Я свят!
Ты бешенный старик! Ты узник!
Чу! За бортом крик!
Ах, я невольник!
Я невольник!
сто тысяч воплей режут душу,
В которой ныне правит стыд.
И Ной бросается наружу —
Он счастьем от безумства сыт.

* * *

Упади, словно птах на твердыню,
Растворись, словно пар в небесах,
Усмири свою злую гордыню—
Будешь гением в наших глазах.
Будешь гением, станешь пророком,
Только стань за черту к мертвецам.
Мы же бронзой тебя ненароком
Обольем от ступней до лица.
Мы возьмем твои умные мысли
И размножим в больших тиражах —
Даже числа исполнятся смысла,
Если их умножать, умножать...
Так умри ж! Остальное за нами —
Будет пухом гранитная твердь.
Мы готовим последний экзамен —
Гений должен уметь умереть.

«ЧАЛАВЕК МОЖА БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМ,

Яго любімы колер — белы, любімая пара года — вясна, а каханне ён лічыць самым каштоўным з таго, што ёсць у чалавечым жыцці.

АЛЕГ АТАМАНАЎ — ПЕРАМОЖЦА ПЕРШАГА КОНКУРСУ БЕЛАРУСКАЙ БАРДАЎСКАЙ ПЕСНІ, ШТО ЛАДЗІЎСЯ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ТАМУ Ў ДОМЕ ЛІТАРАТАРА. АКРАМЯ ГЭТАГА, АТАМАНАЎ ВЫКЛАДАЕ РУСКУЮ І БЕЛАРУСКУЮ МОВЫ Ў БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЭ І ГАДУЕ РАЗАМ З ЖОНКАЮ ДУХ СЫНОЎ — КІРЫЛА І АРЦЁМА. ЖОНКА — ПРАФЕСІЙНЫ КАМПАЗІТАР МАРЫНА МАРОЗАВА. ТАМУ ПЕРШАЕ ПЫТАННЕ...

— Алег, музыку да сваіх песень вы пішаце разам з жонкаю?

— Не. Кожны з нас творыць самастойна.

— Алег, вы называеце сябе і бардам, і аўтарам-выканаўцам. Як гэта зразумець?

— Я лічу, што ў беларускім бардаўскім руху ёсць два накірункі: першы з іх — традыцыйны, з арыентацыяй на расейскія ўзоры, а другі — з апорай на моўную меладычную плынь, уласна беларускую. Абысціся ў другім выпадку без лепшых лірычных твораў беларускіх паэтаў — немагчыма. Сапраўдны бард павінен умець усё. тым больш у нашых абставінах, калі людзі, перад якімі выступаеш, чакаюць ад цябе і высокай культуры выканання, і запамінальных мелодый, і самых разнастайных пачуццяў. Тым больш, што гэта непарыўна звязана з працэсам абуджэння нацыянальнай свядомасці, далучэння да беларускага слова. І апошняе — чыста бардаўскі накірунак больш элітарны. А задача барда на Беларусі некалькі іншая.

— Чаму ў вашым рэпертуары так мала вясёлых песень?

— Я люблю лірыку, раманcы, а вясёлых рамансаў чамусьці яшчэ не сустракаў...

— А наогул, ці можа чалавек быць шчаслівым?

— ...Можа быць шчаслівым, калі ён самаўдасканальваецца.

— Вы задаволены сабою?

— Задаволены, але не зусім: шкада, што не паспяваю шмат чаго зрабіць у жыцці.

— А што самае незвычайнае ў нашым жыцці?

— Кожны чалавек — рэч незвычайная, само жыццё незвычайнае. Трошкі гучна, але мне так здаецца.

— На вершы якіх паэтаў вы складаеце свае песні?

— Я апрацоўваю і народныя песні. З паэтэс мне асабліва падабаюцца Людміла Паўлік, Ніна Мацяш. Ёсць у мяне песні на вершы Міколы Пракаповіча, Алега Лойкі, Алеся Касько, Алеся Разанава, Якуба Коласа, Алеся Гаруна, Уладзіміра Марука, Алеся Пісарыка... Ну а астатнія — на вершы Алега Атаманава.

— Алег, а калі лепш спяваецца?

— Каб назваць дакладна суткі, час, дзень і г.д.—не. Я думаю, усё залежыць ад настрою і, вядома, ад натхнення.

— У вас ёсць які-небудзь асноўны жыццёвы прынцып?

— Ёсць. Але гэта хутчэй не прынцып, а проста нейкае імкненне, жаданне — усіх кахаць...

— І апошняе пытанне: над чым вы зараз працуеце?

— Над сабою. Імкнуся пераадолець нейкія абставіны і жыццёвыя цяжкасці, застаючыся духоўна чыстым.

Гутарку вяла Таццяна КАЗАК.

Песні ў выкананні Алега Атаманава трэба слухаць, бо тое ўражанне, якое яны пакідаюць, цяжка выказаць.

А каб вы ўявілі і адчулі незвычайную лірычнасць, нейкую ўзнёслую ўзрушанасць, неспакой яго духоўнага строю, прапануем да вашай увагі некалькі вершаў барда.

* * *

Бяссоння майго ікебана —
Тры ружы на срэбнай далоньцы,
Засохлыя грацыі сонца —
Тры позіркі, тры асаны...

Алег АТАМАНАЎ

* * *

Упаў на вочы цень,
Палоннік дрохкіх веяў.

Гляджу я, а ў слязінцы —
Агеньчык, сіні-сіні...

Рука твая імкне
Да клавішаў былога.

* * *

Імгла за вокнамі, імгла.
Імкне да шкла лісцё.
Звычайны дзень.
Мінорны лад.
Мінорнае жыццё.

Здаецца, гэтак жа было
Са мной дуўным-даўно...
Дождж-кампазітар,
Сцэна-шкло
І кроплі бегкіх нот...

Сцякаюць ціха і гучаць:
— До-ля, до-ля, доля.
Іграе лёс, іграе час,
А выканаўца — я...

* * *

Якога прагнем вызвалення
З мальбою: любы, адпусці...
Я прад табою на каленях,
Удзячны богу, што спасціг

Сваю высокую свабоду —
З табой адной, з тваім жыццём,
З тваёй пяшчотай першароднай,
З тваёй душой, як адкрыццём,

Свайго кахання выпраменнасць —
На вуснах, у вачах тваіх,
Тваю святую неад'емнасць
Сваім жыццём з табой спасціг...

Лаўлю трывог тваіх дыханне.
Як хочаш будзь, ды прад усім —
Не адпускай майго кахання,
Аб немагчымым — не прасі...

* * *

І сцены фатаграфуюць.
Доказ — нашы твары.
Чатыры сталёвыя блокі —
Чатыры сталёвыя твары.

Чатыры напрамкі свету
І наша гвалтоўная памяць,
Што недзе зямля ёсць і неба...

* * *

Імгненне памяці...
І вецер-крык
паміж каменняў
і дрэў душы—
застыў,
Як голас жыцця...



КАЛІ ЁН САМАЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА»

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, І-ы Загарадны зав., 3.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

18 сакавіка
Зак. 1699.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.